**Калядка Святлана**

# «Творчасць для мяне – работа надзвычай цяжкая …» (дзённікі Максіма Танка)

Творчасць Максіма Танка вельмі шматгранная – ён і паэт, і празаік, і публіцыст, і эсеіст, і грамадскі дзеяч…І да гэтага часу не вывучана на тым ўзроўні, якога патрабуе яго таленавітая спадчына, асабліва дзённікі як важная крыніца вывучэння творчай індывідуальнасці Максіма Танка. Дзённікі вяліся паэтам з рознай перыядычнасцю запісаў з 1935 па 1994 гг., выключаючы 1940 і 1947 гг. Тэксты дзённікаў падзяляюцца на дзве часткі – «Лісткі календара», уключаныя ў шасцітомны Збор твораў паэта, і непасрэдна дзённікі, ўпершыню апублікаваныя ў часопісе «Полымя» (1996 – 97 гг.) ужо пасля смерці Максіма Танка.

«Лісткі календара» ахопліваюць пяць гадоў з 1935 па 1939 гг. віленскага перыяду ў жыцці паэта. А гэта вельмі важныя гады ў фарміраванні асобы Яўгена Іванавіча Скурко.

Максім Танк адзін з тых самародкаў, які, не маючы вышэйшай адукацыі, набываў яе ўсё жыццё самастойна і ў гэтым дасягнуў значных вынікаў. Адзначым, што Яўген Скурко вучыўся ў чатырох гімназіях (Рускай гімназіі ў Вілейцы, Радашковіцкай беларускай гімназіі, Віленскай беларускай гімназіі, Рускай гімназіі імя А.С. Пушкіна у Вільні), не скончыўшы пры гэтым ні адной: адной з прычын было яго выключэнне з двух гімназій за ўдзел у вучнёўскіх забастоўках. Рэвалюцыйная скіраванасць дзейнасці ў многім кампраментавала яго ў вачах улады і рабіла яго неблаганадзейным, што ў хуткім часе ў 1932 г. прывяло да арышту і знявольвання ў Лукішскай турме. На жаль, няма архіўных матэрыялаў, на падставе якіх мы маглі бы дакладна ўзнавіць даты арышту і знаходжання ў турме ў 1932 г. І толькі ў 1961 годзе з дапамогай сябра Ёнаса Каросаса, літоўскага журналіста, рэдактара газеты “Tiesa”, Танк змог атрымаць дакладную інфармацыю пра 1933 – 34 гг.: “По имеющимся у меня выпискам из архивных дел могу сообщить тебе следующее:

Ты был арестован 1933. 5. 27.

Процесс Твой состоялся в Вильнюсском окружном суде 1933. 11. 6 и 7. Приговор: Е.Скурко, С.Лавор, С.Скурко – по шесть лет, Гореличонок И, Хвалько М. – по 5 лет, Сицко – 3 года.

Апелляционный суд состоялся 1934.5.1 и Тебя выпустили из тюрьмы (получил 2 года условно).

Совпадение: первый процесс в Октябрьские дни, второй – в Майские.

1934.2.17. тюремный сторож Трухан Александр в камере 175, в которой сидели студент Фейгенберг Давид и Фейгельман Ицек, в вентиляции под парашкой нашёл грипсы.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1934.8.20. Тебя арестовали, а 8.21. допрашивали в Поставах. Окружной суд 1934.12.5. оправдал Тебя по обвинению за грипсы и поэму «Как бог гулял на вечеринке».

Апелляционный суд 1935.2.20 подтвердил решение окружного суда. На Лукишках ты сидел 1934.10.14 в 124 камере. (Рукой Максима Танка дописано: 33 (1932).

Шифры дел: 1/Ф 31, опись 220, дело 169, 1933 год, Дело Серафима Лавора и других.

2/Ф 31, 0 230, д281, 1934 г., Дело Евгения Скурко».

Такім чынам, дадзены ліст ад Каросаса і прыкладзеныя да яго копіі дакументаў адлюстроўваюць перыяды знаходжання паэта ў Лукішскай турме і, што вельмі важна, дапамагаюць вызначыць ролю асуджаных разам з Максімам Танкам членаў Камуністычнага саюза моладзі і Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі ў справе адстойвання беларускай мовы і беларускай культуры ўвогуле. У БДАМЛМ, ф.25, неапрац. матэр. захоўваюцца копіі дакументаў на польскай мове з двух судовых спраў 1933 і 1934 гг., па якіх мы можам устанавіць храналогію допытаў і зняволення Яўгенія Скурко ў кастрычніку 1934 года.

Нам удалося даведацца з судовых спраў, што пералічаныя ў іх Серафім Лавор, Ян Гарэлічонак, Міхаіл Хвалько, Сяргей Скурко, Мікалай Сіцко былі прама ці ўскосна задзейнічаны ў стварэнні газеты-аднадзёнкі "Беларускае жыццё" (першы ж нумар, які выйшаў 7 красавіка 1932 года, быў канфіскаваны польскай адміністрацыяй і трапіў у судовую справу ў якасці рэчавага доказу). Маладыя людзі атрымалі розныя тэрміны зняволення – ад трох да шасці гадоў. Ян Гарэлічонак (нар. у 1906 г.) -- сапраўдны рэдактар газеты, фатаграфія якога прыкладзена да судовай справы і на адвароце рукой Максіма Танка напісана: рэдактар газеты "Беларускае жыццё" ў 1932 г.; па афіцыйнай версіі рэдактарам газеты "Беларускае жыццё", што выдавалася ў Львове, лічыўся Ян Савіцкі. У канфіскаваным нумары ўпершыню быў надрукаваны верш Максіма Танка "Заштрайкавалі гіганты коміны" пад псеўданімам Максім Танк, таксама былі змешчаны артыкулы "На абарону ТБШ" і "Супроць ліквідацыі беларускага школьніцтва!", якія і выклікалі крутыя меры з боку польскай адміністрацыі не толькі ў дачыненні да нумара, але і да яго стваральнікаў.

Пасля апублікавання "Лісткоў календара" у часопісе "Полымя" ў 1967 годзе Ёнас Каросас як непасрэдны ўдзельнік многіх падзей, апісаных у "Лістках календара", і ўважлівы чытач дзённікаў, звярнуўся да Максіма Танка з такімі прапановамі і парадамі (ліст захоўваецца ў БДАМЛМ, ф.25, неапрац. матэр.):

"Дорогой Максим! Прочитал присланный тобою «Полымя» 2/67, «Листки календаря» -- замечательные. Ожидаю окончания.

В предыдущем письме я выразил свое восхищение твоими воспоминаниями, хорошо переданным виленским колоритом, живым и привлекательным стилем, актуальным созвучием и т.д.

Сообщил и некоторые замечания. Теперь оба номера у меня и могу Тебе поочередно сообщить все свои замечания.

1935. I.15. Дай фамилию Сцяпана. Он ведь инженер белорус из Праги. Пусть все знают, что в движении были и белорусы инженеры, адвокаты, врачи, а не только «гречкосеи». Эта нация полноценная, со своими традициями богатыми. Если Сцяпан отошел от движения, то в скобках можешь об этом вспомнить, но фамилию дать надо.

1935. IV. 22. Обязательно и фамилию и К. – ведь его брат погиб на Лукишках!!!

1935. XII. 9. Штраль – не ресторан, а кавярня. На ул. Мицкевича было два Штраля: Tatarskiy i Mickiewicha – "czerwony Sztral", а за рестораном "Bristol" был "Zielony Sztral".

1935. XII. 19. Нехорошо «здох» Радзивил. «Листки» будут читать и в Варшаве! Это само касается и смерти Пилсудского. Он не «здох»(?).

1936. I. 9. Официально процесс назывался "Proces jedenstve", так как раньше были "proces 54", "proces 56", "proces Hromady", "process 74" и т.д. Во всех газетах так было. «Proces levič academickie" это уже вторичное название.

1936. IV. 5. В Варшаву дорога идет не через Н.Вилейку (это направление в Свеньцяны), а через Панары, Landworouz.

1936. IV. 7. Теперь памятник Понятовского стоит перед зданием Кабинета министров. Понятовский в большом почете. Маяковский с левацких позиций писал о Понятовском.

1937. III. 30. Дай полную фамилию В. Почему замалчиваешь «адукаваных» белорусов.

1938. II. 17. По-моему Трахим (Буткевич) был замучен в Вильнюсе в дефе контрразведки на ул. Ясинского, а не Павияку. Проверь у Орехвы или у «Павлика». (Рукой Танка дописано: Быў забіты ў Варшаве.

1938. III. 2. Не Ян, а Юзеф Мацкевич (Рукой Танка пазначана: Быў і Ян – яго брат).

Прошу вставить:

1938. VI. 25. (иль позднейшую дату). В этот день литовские товарищи выдали специальный номер своего литературного журнала, который выходил однодневкой, так как не получили разрешения старосты на постоянное издание – «Пювис» («Piūvis"). Стихи М. Танка, М. Машары, М. Василька, Н. Арсеньевой, Хв. Ильяшевича и др. в переводах Ю. Кекштаса, А. Жукаускаса, О. Мицютэ, В. Дремы, статьи о белорусской литературе и искусстве Западной Белоруссии.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Это важный факт. Ибо о Западной Белоруссии поэтах Каунаский парнас узнал через наши журналы. Об этом пишется и в Истории литовской литературы. Ясно, я подал только факт, а Ты используй.

1938. XI. 1. Правильно «Летувос айдас» («Lietuvos aidas»).

1938. XI. 27. Дай всем полные имена: Альбинаса Жукавскаса, Юзаса Кекштаса, Казиса Боруты, Антанаса Мишкиниса (его допиши, был очень популярный в довоенные годы поэт, теперь живет в Вильнюсе), Ионаса Косу-Александравичюса (он теперь в США, но ничего в этом страшного)… Юлюса Янониса (Julius Janonis).

Я вторично говорил с директором «Vaga» Чекисом об «Листках». Он втянул их в тематический план 1968 года. Я ему говорил, что книга Твоя выйдет еще в конце этого года. Не ошибся ли я? Чекис – наш старый друг. До войны он писал стихи и под фамилией Чейкаускаса печатался в наших изданиях. Просил тебе передать братский виленский привет.

Когда будешь мне посылать окончание «Листков», напиши и коротенькое письмо. Кто Лю, о которой не однократно вспоминаешь в «Листках»?

Я еще в больнице. Думаю, через 10 дней быть уже дома. Едуардас уже работает.

Крепко жму. Каросас

P.S. Сердечный привет Любе. Моя жена радушно поздравляет Вас».

У лісце ад 18.II. 1967 г. Ё. Каросас адзначае: “Почему поставил в одну шеренгу Буткевича, Павлика, Герасима и Гришу. Разница есть. Павлик не Гриша. Подумай! Не чего в одну шеренгу ставить… Я считаю, о скульпторе Якимовичюсе однобоко написал. Сделал он памятник (проект). Факт. Но сколько памятников сделали Иосифу?!! Даже Браневский, не говоря о других. Реакционером он никогда не был…».

У лісце ад 9.III. 1967 г. Ё.Каросас дадае (лісты захоўваюцца ў БДАМЛМ, ф.25, неапрац. матэр.): «С. – гэта Тэадор Аніскевіч (гл. мае ўспаміны ў кн. «Вільнюскае падполле» (с.149).

Безумоўна, заўвагі Каросаса – гэта адна з версій трактоўкі дат, падзей, асоб, але яна мае права на існаванне і не лічыцца з яго заўвагамі і парадамі было б нелагічна. І як вынікае з падкрэсленых рукой Максіма Танка ў тэксце ліста сказаў і некаторых яго каментарыяў, ён не толькі ўважліва знаёміўся з заўвагамі, але і пераправяраў інфармацыю дзеля максімальнага набліжэння да гісторыі як рэальных жывых падзей ў канкрэтных абставінах з канкрэтнымі дакладнымі датамі.

Увогуле, у падпольнай працы Максіму Танку давялося актыўна супрацоўнічаць з літоўцамі, і затым, у пасляваенны час, да яго звярталіся як да вядомага паэта і грамадскага дзеяча з просьбай даць характарыстыку, напісаць водзыў ці даведку і г.д., і Яўген Іванавіч нікому не адмаўляў. У архівах Танка захоўваецца некалькі лістоў з падобнымі просьбамі (ад К.В.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мацконіса-Мацкявічуса, ад Б. І. Сабукаса, за Ю. Айдуліса прасіў Ё. Каросас), а гэта дазваляе даследчыкам папоўніць спіс людзей, з якімі давялося Максіму Танку ў свой час працаваць у падполлі. Напрыклад, Мацконіс-Мацкявічус Костас Віццасавіч (ліст адпраўлены 17 жніўня 1960 г.) дае пра сябе такую інфармацыю: “1910 года рождения. В КСМ ЗБ состоял с 1929 по 1933 гг. С 1933 по 1938 гг. – в рядах КПЗБ. За революционную деятельность сидел в Лукишской тюрьме г. Вильнюса с апреля 1932 года до осени этого же года. Точной даты освобождения из тюрьмы не помню. Ты тогда тоже сидел в тюрьме. Мы ходили на одном «спацере». Наверное, помнишь и тот факт, как я с тобой должен был купить ротатор для подпольной печати, но у тебя тогда нога болела. Мы имели общие и другие задания по поручению КСМ или КПЗБ ЗБ». Адзначым, што ў судовых справах 1933-34 гг. Максім Танк і яго калегі з'яўляюцца членамі Камуністычнай партыі, Мацконіс называе яе Камуністычным саюзам моладзі Заходняй Беларусі – гэтыя разыходжанні ў назвах звязаны, на нашу думку, з заведамым абвінавачваннем польскім судом Максіма Танка і яго паплечнікаў як членаў партыі – гэта давала падставы бачыць у іх дзейнасці антыўрадавую скіраванасць і таму ставіцца да маладых людзей як да дарослых і небяспечных ворагаў.

Знаходзіліся сярод яго калег і незадаволеныя, якія выказвалі прэтэнзіі ў сувязі з тым, што Максім Танк не надае ім пэўнай увагі і гэтым прымяншае іх ролю ў рэвалюцыйнай барацьбе ў Заходняй Беларусі, як гэта адлюстравана ў лісце Склубоўскага В. (1911 – 2002), які быў рэдактарам газеты “Наша воля” – легальнага выдання КПЗБ, органа Народнага фронту, што выдавалася ў Вільні ў 1935 – 1936 гг.:

Ліст ад 10 лістапада 1958 г.: «Некалькімі словамі з наяўным Вам талентам Вы накрэслілі цёмную сільвэтку на рэдактара «Нашай волі». З Вашых слоў усё ж такі не можна зразумець, чым жа кіраваўся Склубоўскі, калі згадзіўся на рэдагаванне «Нашай волі», наражаючыся амаль на пэўную турму, паліцэйскія шыканы і перачыркваючы ўсякія перспектывы на атрыманне ў будучыні якога кольвячы становішча ў прафесіі, якую ён выбраў? Ці Вы ведаеце, Грамадзянін Танк, што якраз у той час і найболей у той час я неаднаразова млеў ад голаду. Думаю, што не, бо Вас гэтыя справы не абходзілі, а словы жальбы ад мяне ніхто не пачуў.

Хіба да Вас дайшло тое, колькі разоў мяне трэсла і шыканавала паліцыя. І не толькі мяне, але і маіх забітых горам бацькоў, якія часта сядзелі так, як і я, без хлеба.

Вы павінны ведаць, што я за «Нашу волю» зарабіў два судовыя прыгаворы. Магчыма, што Вы чулі і тое, што падчас працэсу Дэмбінскага і Ендрыхоўскага і іх групы рыхтаваўся гэткі ж працэс беларускай левіцовай інтэлігенцыі, у якім мне было адведзена пачэснае месца…

Вы можаце мыліцца, бо гэта справа людская, але не магу Вас уявіць несправядлівым. Вывад з ліста зрабіце такі, які Вам падкажа сумленне Савецкага Чалавека. З пашанай В. Склубоўскі». Адзначым, што слова Максіма Танка было важным як для сучаснікаў, так і для сяброў, калег, знаёмых па падпольнай працы ў Заходняй Беларусі і рэдактарскай працы ў гады вайны, таму вельмі ўважліва, удумліва і недзе з прэтэнзіямі чыталіся яго ўспаміны.

Нельга не ўзгадаць і тое, што ў 30-ыя гады Максім Танк вёў актыўную дзейнасць у падпольнай арганізацыі і актыўна выступаў у літаратуры як крытык, што адлюстравана ў артыкуле j.n. (Язэпа Найдзюка) "Не-стары – Максім Танк – Міхась Машара": палемічныя зацемкі, надрукаваны ў часопісе "Шлях моладзі": "Максім Танк, як усім ведама, зьявіўся на беларускай літаратурнай ніве нядаўна. Паэт гэты мае бясспрэчна не малы талент і беларускае грамадзянства спаткала яго вельмі прыхільна, а пэўная група людзей нават энэргічна высоўвае яго на першае месца. З агульным прызнаньнем Танка паэтам таленавітым не згадзіўся, і то яшчэ ў форме непрызваітай, крытык "Роднага краю", нехта "Не-стары" (*маецца на ўвазе Макар Краўцоў (1890 – 1941) – беларускі паэт і празаік, перакладчык рускай класічнай літаратуры на беларускую мову. Тут маецца на ўвазе яго супрацоўніцтва ў газеце "Родны край" (1933 – 1936), органе Таварыства беларускай асветы – С.К.*), каторы ў №4 успомненага часапісу востра заатакаваў Танка. Выступленьне "Не-старога" выклікала ў грамадзянстве незадавальненьне і нясмак. Зарэагаваў на гэта і сам Танк у № 7 (8) "Нашай волі" вершам "Крытык", у якім, пачынаючы ад сабак, дэфэнзывы, касьцей і розных іншых "красных славечак", злаяў і збэсьціў "Не-старога". Выступленьнем гэтым, ясна, Танк пабіў сябе ў агульна-грамадзкай апініі горш, чымся біў яго "Не-стары", і бязумоўна аслабіў варожасць настрояў супраць "Роднага Краю", а што найгорш – выявіў нявытрыманасць і вялікую чуткасьць на крытыку.

…Адказаўшы "Не-старому", Танк ускладае на сябе рызу крытыка і пачынае "крытыкаваць"… І то каго?.. Свайго старэйшага таварыша, Міхася Машару…Ды яшчэ як?.. – Словам, той-жа Танк, які так востра выступаў супроць "Не-старога", у сваёй крытыцы адносна Машары куды перавысіў "Не-старога"…

…Бараніць Машары ад Танкавай крытыкі мы ня будзем, бо яна плыткая, вузкая, злосная, беспадстаўная і някультурная. Агулам Танк чамусьці надта вуска ўсё бярэ і хоча ў кожным творы бачыць толькі праграмы, клясавасьць, партыйнасьць і па-над гэта ня можа падняцца. А гэта, на наш пагляд, кепска. Бо ня можна да ўсяго падходзіць па-масонску. А іменна, што тое, што ёсьць маёй партыі, майго кірунку, хоць яно і гнілое, то аднак дабро, а рэшта – ўсё дрэнь…Дык ня дзіва, напрыклад, што

Машара шукае наўперад чалавека беларуса, якому справа Беларусі ёсьць блізкай, а не тых ці іншых партыйцаў…”.

Такім чынам, Максім Танк спрабаваў сябе ў ролі крытыка і быў неаднойчы раскрытыкаваны, аднак усё гэта толькі садзейнічала яго творчаму росту: ён умеў браць урокі з уласных памылак і вучыцца ў іншых.

Пасля далучэння Вільні да Літвы Максім Танк пераязджае ў Вілейку і працуе ў “Віленскай праўдзе”, “Сялянскай газеце”.

Для Максіма Танка перадваенныя гады сталі іспытам на адданасць справе, на благанадзейнасць і вернасць партыйным ідэалам. Быў вельмі няпросты час, калі ворагамі народа называліся нават правераныя людзі, якія прайшлі праз полымя рэвалюцыйных падзей і засталіся адданымі сынамі сваёй радзімы. Даносы, у якіх белае станавілася чорным, а паклёп без праверкі ўспрымаўся за выкрывальніцтва ворага, перайначылі лёсы адных, а для іншых сталі прыгаворам. Як адзначалі многія даследчыкі творчасці Максіма Танка, у той час і ён трапіў у рухавік знішчальнай машыны НКВД, аднак не знайшлося сур'ёзных прычын для арышту. Але сям'я Максіма Танка атрымала сур'езнае абвінавачванне, пра што сведчыць наступны дакумент (захоўваецца БДАМЛМ, ф.25, неапрац. матэрыялы):

**ВЫПИСКА**

из протокола №4 заседания исполкома
Мядельского райсовета депутатов трудящихся

от 20-го января 1941 г.

Слушали: Об отмене постановления РИК от 8 октября 1940 г. об отнесении хозяйства г-на Скурко И.Ф. к кулацко зажиточным хозяйствам и утверждении рыночного дохода в сумме 1995 руб.

Решили: Отменить постановление РИК от 8.X.1940 г. об отнесении хозяйства г-на дер. Пильковщина Калиновского с/совета Скурко И.Ф. к числу кулацко зажиточных хозяйств и утверждения рыночных доходов.

Оставить облагаемый сельхоз. налогом доход только от с/хозяйства.

Зав. общим отделом Зверуго

Менавіта па прычыне таго, што сапраўдных гаспадароў з сям'і Скурко назвалі кулакамі, лёс Максіма Танка мог прывесці яго ў засценкі турмы альбо ў далёкія раёны Сібіры. У дзённіках ад 30.IV.1942 г. Танк піша: «Ведаў я Пятра Захаравіча Калініна па Вілейцы, дзе ён працаваў сакратаром абкома і заступіўся за маіх бацькоў, якіх у 1941 г. збіраліся вывезці ў Сібір». Дзякуючы ўмяшанню партыйных улад, бацькі Танка пазбеглі долі ссыльных. На нашу думку, з-за вышэйпералічаных драматычных для бацькоў падзей і незаслужанага іх абвінавачвання, а разам з імі і Максіма Танка як сына кулакоў 1940-ы год быў неспрыяльным для творчасці і прынёс мала плёну Танку як паэту. На нашу думку, гэта магло стаць прычынай адсутнасці дзённікавых запісаў у 40-ым



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

годзе: Танк разумеў, што любое слова можа стаць небяспечным і павернутым супраць яго, калег, сяброў і яго сям'і. Невядома, як склаўся бы лёс паэта і яго сямейнікаў, калі б не вайна. Адмена пастановы не магла зняць падазрэнні «дбайных» службістаў і ўсё ж наводзіла цень на бездакорную біяграфію сям'і беларусаў-працаўнікоў. Падчас Вялікай айчыннай вайны Максім Танк заставаўся верным сваім прынцыпам і адданасці сваёй радзіме -- Беларусі: для яго незалежнасць радзімы, свабода і мір з'яўляліся не проста прыгожымі лозунгамі, а заклікам да дзеяння, да жыцця. Таму ён з першых дзён імкнецца трапіць на фронт, хоць яго жонка цяжарная і павінна хутка нарадзіць. Асабістыя праблемы адыходзяць на другі план, першасным і адзіным было ў той перыяд для Яўгена Іванавіча ўбачыць радзіму вольнай. Гэта адзіная ўмова для далейшага жыцця і творчасці і сямейнага шчасця. У архіўных матэрыялах захавалася тэлеграма (БДАМЛМ, ф.25, неапрац. матэр.):

СССР

Народный комиссариат обороны

Главное Политическое Управление Рабоче-Крестьянской Красной Армии управление кадров

Тов. Скурко Е. И.

№ 49133 14 сентября 1941 г.

Предписание

Приказом НКО СССР по л/с. Армии №02726 от 17 сентября 1941 г. Вы назначены на должность писателя редакции фронтовой газеты «За Советскую Белоруссию».

Предлагаю Вам отбыть к месту службы.

Срок отбытия 14 сентября 1941 года.

Об исполнении донести.

Маршрут: Москва – Брянск.

Начальник управления кадров ГЛАВПУРККА – дивизионный комиссар Попов.

Максіму Танку давялося пабываць на многіх участках ваенных падзей, на розных месцах службы. У лісце да А. Фадзеева ён выказвае скаргу ў сувязі з тым, што яго трымаюць у тыле на адміністратыўнай працы і не задзейнічаюць яго здольнасці пісьменніка:

Ульянаўск 19.4.42г. *"Паважаны Тав. Фадзееў!* У тэлеграме, якую я Вам выслаў з Ульянаўска, я Вас прасіў пасадзейнічаць мне зноў вярнуцца ў франтавую прэсу. Справа мая выглядае так: Дзевятага сакавіка 1942 г. ад ПУРККА я атрымаў загад дзесятага сакавіка выехаць у Саратаў, дзе мяне павінны былі выкарыстаць у адной з газет у якасці літработніка. Але ў Сараtаве месца не знайшлося. Накіравалі мяне на адміністр.-гаспадарчую работу ў інцендантскае упраўленне, якое, у сваю чаргу, паслала мяне ў Ульянаўск на перакваліфікацыю. Праз пару месяцаў я буду малодшым камандзірам. Я не



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ведаю, якія прычыны паслужылі таму, што мне далі загад выехаць з газеты, ў якой я працаваў і ў якой я не быў лішнім чалавекам. Можа таму што заднік? Зноў-жа, пярэчыць гэтаму тое, што я – ў школе. Для мяне ўсё гэта не толькі незразумела. Бо будучы на фронце і працуючы там па сваей спэцыяльнасці я прынёс-бы карысці шмат больш,  як там, дзе знаходжуся цяпер не маючы магчымасці пісаць. Ды пасколькі мне ведама, да гэтага часу, ніхто якраз у такой перакваліфікацыі пісьменнікаў не быў і не зацікаўляны. Усе гэта перарвала маю работу, якую ў абставінах франтавой прэсы я мог-бы кончыць за пару месяцаў, а тут мне нават не прыходзіцца аб гэтым марыць і думаць. Таму прашу Вас, таварыш Фадзееў, калі магчыма, памагчы мне выясніць маю справу.  З прывітаннем Максім Танк”.

У гэтым жа 1942 г., праз некалькі месяцаў, Максім Танк адпраўляе тэлеграму на адрас Любанскага ў Маскву з мэтай вярнуцца на службу пасля выздараўлення ў санаторыі “Болшево”. Ён хоча заставацца карысным і неабходным у вялікай справе вызвалення радзімы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і біць іх зброяй слова, што ў гады вайны мела вялікую сілу ўздзеяння, умацоўваючы дух салдата, надаючы яму непахісную веру ў пабеду.

*“Уважаемый тов. Любанский!* Скоро кончается срок моей путёвки в Болшево. Очень прошу Вас сделать возможное для моего определения в Кр.Армию.

Неужели же человек моей квалификации не нужен?

Позволю себе напомнить Вам, что я – очеркист, редактор, переводчик, театровед, окончил факультет совправа.

Если дело в моем билете  |снятие с учета|, то я согласен явиться во врачебную комиссию и сообщить о том, что я выздоровел и готов снова быть на учёте. Попробуйте – ведь Вы у нас главный по военной части. Очевидно, Вы можете войти в контакт с наиболее ответственными политическими работниками Армии и Флота.

Итак, ещё раз прошу  Вас «снестись», как говорится на канцелярском языке.

Заранее благодарный Евгений Канторович /“Евг.Танк”/ 22.10.42”.

Сямейнікі ў час вайны прымалі актыўны ўдзел у ваенных падзеях, забяспечваючы салдат і партызан адзеннем і харчаваннем, аднак у 1943 годзе, як бацькі «Советского патриота и Белорусского писателя Максима Танка» былі вызвалены ад гэтага абавязку. У БДАМЛМ, ф.25, неапрац. матэр. захоўваецца некалькі даведак, выдадзеных на працягу 1943 года рознымі адміністрацыйнымі асобамі на імя Скурко Івана Фёдаравіча, сярод якіх наступная:

**СПРАВКА**

У гражданина СКУРКО, дер. Пильковщина, Мядельского р-на, отца белорусского поэта Максима Танка запрещается всем партизанским отрядам и группам, находящимся временно или постоянно в данной местности, производить заготовку как продовольствия, обмундирования и личных вещей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Начальник военно-оперативного отдела Партизанского центра Вилейской области Марков

14. XI.43 г.

Такім чынам, “Лісткі календара” і дзённікі Максіма Танка – важная крыніца вывучэння станаўлення творчай індывідуальнасці паэта, вызначэння яго светапогляду і сацыяльна-грамадскіх пазіцый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ